**Блізнюк І. А.**
*Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь*
*Беларусь, Мінск*

# АКТЫВІЗАЦЫЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ І ПРАБЛЕМЫ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ КУРСАНТАЎ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ТЭМЫ «ВАЕННАЯ ФРАЗЕАЛОГІЯ»

У артыкуле разгледжаны эфектыўныя формы, метады і прыёмы патрыятычнага выхавання курсантаў пры вывучэнні тэмы «Ваенная фразеалогія» ў межах выкладання дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)».

*Ключавыя словы: фразеалагізм, ваенна-патрыятычнае выхаванне, формы, метады і прыёмы патрыятычнага выхавання, выхаваўчы аспект.*

**Blizniuk I. A.**
*Military Academy of the Republic of Belarus*
*Belarus, Minsk*

# INTENSIFICATION OF COGNITIVE ACTIVITY AND PROBLEMS OF PATRIOTIC EDUCATION OF CADETS WHILE EXPLORING THE TOPIC «MILITARY PHRASEOLOGY»

The article discusses the effective forms, methods and techniques of

patriotic education of cadets while studying the topic «Military phraseology» within the teaching of the discipline «Belarusian language (professional vocabulary)».

*Key words: phraseology, military-patriotic education, forms, methods and techniques of, military-patriotic education, educational aspect.*

Пра ролю фразеалагізмаў у патрыятычным выхаванні падрастаючага пакаленнянапісана шмат прац, праведзены шматлікія даследаванні, тым не менш, актуальнасць гэтай праблемы не страчваецца, наадварот, яна набывае асаблівую значнасць у вышэйшай ваеннай навучальнай установе. І таму ёсць тлумачэнне. Па-першае, ваенная справа – гэта тая сфера дзейнасці, дзе неад'емнай часткай слоўнікавага запасу афіцэра з'яўляюцца фразеалагізмы, якія патрабуюць камунікатыўнай, прафесійнай і лінгвістычнай кампетэнцыі і моўнага майстэрства пры іх ужыванні ў працэсе маўлення. Па-другое, падрыхтоўка ваеннага спецыяліста непарыўна спалучаецца з ваенна-патрыятычным выхаваннем будучых абаронцаў Айчыны, здольных у экстрэмальнай сітуацыі ўстаць на яе абарону і клапаціцца пра захаванне матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей народа.

Ваенна-патрыятычнае выхаванне курсантаў у Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь – гэта мэтанакіраваная дзейнасць па фарміраванні ў навучэнцаў высокай патрыятычнай самасвядомасці, пачуцця вернасці Радзіме, асэнсавання імі асабістай адказнасці і гатоўнасці да выканання грамадзянскага абавязку па абароне яе інтарэсаў.

Зразумела, што вырашальная роля ў працэсе фарміравання прафесійна-практычных якасцей будучых афіцэраў належыць асноўным, прафілюючым дысцыплінам, аднак і непрафілюючыя дысцыпліны, адной з якіх з'яўляецца «Беларуская мова. Прафесійная ваенная лексіка», маюць магутны выхаваўчы патэнцыял.

У гэтым артыкуле будуць разгледжаны эфектыўныя, на наш погляд, формы, метады і прыёмы патрыятычнага выхавання курсантаў у межах выкладання вышэйназванай дысцыпліны.

Сродкамі навучання і выхавання з'яўляюцца: вучэбны дапаможнік «Беларуская мова. Прафесійная ваенная лексіка», дзе шырока разглядаецца тэма «Фразеалогія»; вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне.

Праца над тэмай «Фразеалогія»заснавана ў першую чаргу на прынцыпе пераемнасці навучання. У працэсе калектыўнай працы з апорай на веды, атрыманыя ў школе, праводзіцца класіфікацыя фразеалагізмаў, даследуюцца семантычныя, лексічныя і сінтаксічныя асаблівасці беларускіх фразеалагізмаў. Курсантам прапануецца шырокі выбар практыкаванняў, накіраваных на актывізацыю іх пазнавальнай і творчай дзейнасці (ад знаходжання ў тэксце фразеалагізмаў, узнаўлення іх па апорных словах

да супастаўлення фразеалагізмаў у рускай і беларускай мовах; ад падбору адпаведнікаў і сінанімічных радоў да рэдагавання сказаў з памылковым ужываннем фразеалагізмаў).

Наступны ўзровень дзейнасці, больш складаны, – гэта вывучэнне ваеннай фразеалогіі.

Курсанты знаёмяцца з крыніцамі ўтварэння фразеалагізмаў, асноўнай з якіх стала ваенная тэрміналогія з яе новым, вобразным, метафарычным значэннем. Асаблівая ўвага звяртаецца на фактары, якія спрыялі ўтварэнню такіх выразаў: ваенныя падзеі ў жыцці беларускага, як і кожнага іншага, народа; актыўны ўдзел беларусаў у барацьбе з ворагам; шырокае адлюстраванне падзей Вялікай Айчыннай вайны ў мастацкай літаратуры, публіцыстыцы і інш. Усё гэта спрыяла шырокаму выхаду ваеннай тэрміналогіі за межы яе прафесійнага выкарыстання і стала вызначальным ва ўзнікненні фразеалагізмаў.

Практыкаванні, накіраваныя на фарміраванне навыкаў выкарыстання фразеалагізмаў у моўнай практыцы:

а) тлумачэнне лексічнага значэння фразеалагізмаў *(выклікаць агонь на сябе, ціхай сапай, адзіным фронтам і інш.);*

б) раскрыццё сэнсавага зместу фразеалагізмаў *(разведка боем, баявое хрышчэнне, халодная вайна, артылерыя – бог вайны);*

в) вызначэнне этымалогіі ваенных фразеалагізмаў *(трымаць порах сухім, ламаць коп'і, ціхай сапай, са шчытом ці на шчыце);*

г) пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую з наступнай высновай аб паходжанні фразеалагізмаў *(«Пришел, увидел, победил!», «С открытым забралом», «Огнём и мечом»);*

д) складанне звязнага тэксту з ужываннем зададзеных фразеалагізмаў.

Выхаваўчая работа не вылучаецца ў асобны аспект, яна ажыццяўляецца ўсёй структурай заняткаў і формамі арганізацыі вучэбнай дзейнасці па тэме. Асноўныя яе напрамкі – ваенна-патрыятычнае, гераіка-патрыятычнае і нацыянальна-патрыятычнае выхаванне курсантаў.

Адным з метадаў вырашэння пастаўленых задач з'яўляецца метад гутаркі.

Курсантам ставіцца праблемнае пытанне: ці ўплываюць ваенныя фразеалагізмы на самасвядомасць чалавека і фарміраванне яго патрыятычных пачуццяў?

У гутарцы выкладчык звяртае выключную ўвагу курсантаў на пазнанне і асэнсаванне таго, што прафесія абаронцы Айчыны заўсёды была ганаровай, а самымі дабрачыннымі паняццямі ва ўсе гістарычныя перыяды былі патрыятызм, гонар і годнасць яе воінаў. Гэтыя паняцці прыйшлі ў сучасныя арміі з глыбокай даўніны, са старажытных часоў. І

старажытнагрэчаскія, і старажытнарымскія дзяржавы нарадзіліся ва ўмовах бесперапынных войнаў, якія сталі неад'емнай часткай жыцця грамадства. Ужо тады людзі асуджалі захопніцкія войны, супрацьпастаўляючы ім дабрачынную, патрыятычную, узброеную барацьбу ў абарону незалежнасці краіны, за свабоду народа. Так, ужо з самага старажытнага часу, закладваліся ў культуру народаў галоўныя якасці воіна – пачуццё патрыятызму, служэнне людзям, вернасць воінскаму абавязку.

Усё сказанае знайшло адлюстраванне ў фразеалогіі, якая паказвае шматвяковую гісторыю народаў, вялікае духоўнае багацце чалавецтва, што назапашвалася з часам і захавалася ў мовах.

Да ваеннай фразеалогіі адносяцца фразеалагізмы, звязаныя з ваенна-гістарычнымі падзеямі, развіццём ваеннай справы, тэхнікі, зброі. У гэту групу уключаюцца, як вядома, крылатыя выразы, афарызмы, дэвізы, выказванні гістарычных асоб (пераважна ваенных). Прыкладам могуць быць такія выразы: *«Жребий брошен, пути назад нет»;»Никакая победа не принесет столько, сколько может отнять одно поражение»(Цэзар); «Кто желает мира, пусть готовится к войне» (Вегецый); «Ради Отечества следует жертвовать даже славой» (Фабій);»Только одно отечество заключает в себе то, что дорого всем» (Цыцэрон).* Цікавасць да іх тлумачыцца тым, што яны прайшлі скрозь стагоддзі і пранеслі ў сабе маральныя і эстэтычныя ідэалы, сугучныя з нашым часам.

Паняцце «патрыятызм» уключае любоў да Радзімы, да зямлі, дзе нарадзіўся і вырас, гонар за яе гістарычнае мінулае. Народ заўсёды імкнуўся прывіць маладому пакаленню любоў да Радзімы, праўдзівасць, сумленнасць, пачуццё сяброўства і таварыства. Сведчаннем таму з'яўляюцца афарызмы, цытаты, выказванні вядомых людзей розных часоў і розных краін, якія абавязкова абмяркоўваюцца з курсантамі: *«Няма ў чалавека нічога даражэй за радзіму. Чалавек без радзімы – жабрак» (Якуб Колас); «Дзе прайшло дзяцінства, там і пачынаецца Радзіма» (Кузьма Чорны); «Мой друг, Отчизне посвятим души прекрасные порывы!» (А. Пушкин); «Нет! Человеку нельзя жить без родины, как нельзя жить без сердца» (К. Паустовский); «Лучшее средство привить детям любовь к отечеству состоит в том, чтобы эта любовь была у отцов» (Монтескье): Самые большие подвиги добродетели были совершены из любви к отечеству» (Ж.-Ж. Руссо).*

*«Эрэнбург); «Цена войны написана аккуратными буквами на тысячах табличек, установленных над солдатскими могилами» (Джордж К. Маршал); «В мирное время сыновья хоронят отцов, в военное – отцы сыновей» (Фрэнсіс Бэкан); «Ветеранов третьей мировой не будет» (Уолтэр Мандэйл); «Юношество, погибшее на войне, – как изъятая из года весна» (Перыкл).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Са сказанага вынікае – ваенная служба, гатоўнасць абараняць Радзіму ад знешняга ворага – неад'емная прымета патрыятызму, а чалавек, які выбраў ваенную службу, – гэта, безумоўна, патрыёт.

У кожнага народа ёсць шэдэўры народнай творчасці, да якіх адносяцца прыказкі і прымаўкі. У беларускіх жа з выключнай паўнатой адлюстраваліся лепшыя якасці народа, яго традыцыі, пачуццё бязмежнай любові да Радзімы:*У сваім краі як у раі;У чужой старонцы не так свеціць сонца; Кожная сасна свайму бору песні пяе; На чужой старонцы рад сваёй варонцы* і інш.

Асобна неабходна вылучыць групу прыказак, якія характарызуюць значнасць Радзімыдля чалавека, напрыклад: *Чалавек без Радзімы як салавей без песні;На Радзіму сонца свеціць бясконца; Родная зямля мякчэй чужой пярыны; Ад душы працуеш – Радзіму шануеш; На родным полі расце лепшая доля;Мінск – сталіца – усяму свету святліца*.

Прыказкі, прымаўкі, афарызмы, як ужо адзначалася, часта ўжываюцца ў сучаснай арміі, у штодзённай рабоце, гутарках афіцэраў з падначаленымі. Яны выконваюць надзвычай важную ролю ў плане выхавання ваенна-патрыятычных пачуццяў, лепшых якасцей характару і падняцця баявога духу воінаў.

Практычная частка працы з прыказкамі і прымаўкамі прадстаўлена рознымі відамі заданняў, накіраваных на актывізацыю пазнавальнай і творчай дзейнасці курсантаў:

а) скласці слоўнік прыказак, прымавак рознай тэматыкі (з наступным абмеркаваннем), у якіх адлюстроўваюцца:

лепшыя якасці воінаў *(Трэск кулямётаў не спужае патрыётаў; Хто змагаецца на славу, той патрыёт на славу; Той герой, хто за Радзіму ідзе ў бой; Дзе смеласць, там і перамога; Ганарлівы ды ўпарты – нічога не варты і інш.);*

заклік да выканання воінскага абавязку *(Бацькоўскі край ад ворагаў абараняй; З роднай зямлі – памры – не зыходзь; Смела ідзі ў бой – Радзіма стаіць за табой!; Бацькоў любі, старых паважай, здароўе беражы, Радзіме верна служы);*

неабходнасць авалодання ваеннымі ведамі і тэхнікай *(Ваеннай справе вучыцца – заўсёды прыгадзіцца; Тэхнікай авалодаеш і ворага адолееш);*

значэнне сяброўства, якое так неабходна ў ваенным калектыве *(Чалавек без сяброў, што печ без дроў; У армію пайшоў – родную сям'ю знайшоў);*

б) пракаменціраваць сэнс афарызмаў: ***(Адвага й гарады бярэ;*** *Кожны воін павінен разумець свой манеўр; Добра быць у дарозе, якую сам выбіраеш);*

в) асэнсаваць сувораўскія выразы аб баявых якасцях воіна, іх рашучасці і стойкасці, якія актуальны і сёння для ваеннага чалавека *(Дисциплина – мать победы; Смерть бежит от сабли и штыка храброго; Опасности лучше идти навстречу, чем ожидать на месте і інш.);*

г) падабраць эквівалентныя паводле значэння беларускія адпаведнікі да рускіх фразеалагізмаў і, наадварот, растлумачыць іх сэнс, выказаць уласную думку *(Раньше думай о Родине, а потом о себе; Не тот – человек, кто для себя живет, а тот – кто народу счастье дает; Если дружба велика, будет Родина крепка; Кто служит Родине верно, тот долг исполняет примерно).*

Ваенна-патрыятычнае выхаванне немысліма без творчасці. Курсантам прапануецца выканаць творчыя працы (зразумела, з выкарыстаннем фразеалагічных выразаў): скласці тэкст-апісанне гераічнага мінулага нашай Радзімы;напісаць сачыненне-разважанне («Патрыятызм і мужнасць», «Ці ёсць месца подзвігу ў мірны час?»; «Ёсць такая прафесія – Радзіму абараняць»);скласці тэкст па зададзеных ваенных фразеалагізмах; падрыхтаваць паведамленні аб ролі ваеннай фразеалогіі ў мове вайскоўцаў, аб паходжанні ваенных фразеалагізмаў і інш.

Набыўшыназаняткахтэарэтычныянавыкіўжыванняфразеалагізмаў, курсанты адпрацоўваюць іх у моўнай практыцы: падрыхтоўка дакладаў на ваенную тэматыку для навуковых канферэнцый, выступленні на конкурсах аратарскага майстэрства, удзел у конкурсе чытача і інш. Усё сказанае, безумоўна, садзейнічае актывізацыі пазнавальнай дзейнасці і развіццю творчых здольнасцей курсантаў.

Па завяршэнні працы над тэмай робіцца абагульненне і курсантампрапануецца адказаць на праблемнае пытанне: наколькі паўплывалі разгледжаныя фразеалагізмы на вашы адносіны да выбранага вамі шляху і ваенна-патрыятычныя пачуцці?

Такім чынам мы можам зрабіць выснову: вывучэнне ваенных фразеалагізмаў мае выхаваўчую накіраванасць. Несумненна, яны пашыраюць уяўленне курсантаў пра сутнасць паняццяў «патрыятызм», «патрыёт», «гераізм», «любоў да Айчыны», дапаўняюць значэнне паняццяў «воінскі абавязак», «служэнне Айчыне», а гэта станоўча ўплывае на фарміраванне патрыятычных пачуццяў, маральных якасцей курсантаў і высокіх ідэалаў служэння сваёй Радзіме.

## Літаратура

1. Блізнюк, Т. І. Беларуская мова. Прафесійная ваенная лексіка / Т. І. Блізнюк, І. А. Блізнюк. – Мінск: ВА РБ, 2013 – 300 с.